Палессе — дзіўны край, падобнага якому няма не толькі ў Еўропе, але і ў свеце. Некранутая чалавекам прырода ў даліне ракі Прыпяць, унікальныя балоты і пойменныя дубровы, багатыя радовішчы — усё гэта вабіць шматлікіх турыстаў. А яшчэ ў Прыпяцкім Палессі захаваліся найбагацейшыя народныя традыцыі і этнакультурная самабытнасць. Аўтэнтычныя песні і танцы, асаблівы палескі дыялект, хатні ўклад і спрадвечныя рамёствы — гэтая спадчына карэнных жыхароў стала адным з турыстычных брэндаў рэгіёна.

З 2010 года ў Нацыянальным парку «Прыпяцкі» праводзіцца фестываль этнакультурных традыцый «Кліч Палесся». Сёлета V Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый сабраў у аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна больш як 1,7 тысячы артыстаў і каля 20 тысяч гледачоў.

Падчас свята два ўраджэнцы беларускага Палесся названы «Ганаровымі палешукамі». Такога звання ўдастоены нязменны кіраўнік заслужанага народнага аматарскага ансамбля «Выцінанка» Столінскага Дома культуры Пётр Астапчук і вядомы беларускі байдарачнік, алімпійскі чэмпіён Беларусі Раман Петрушэнка. Ім былі ўручаны дыпломы і статуэткі-сімвалы (адлюстроўваюць постаці каларытных жыхароў Палесся).

Яшчэ адна разынка фэсту — выбар «Палескай прыгажуні» 2018 года. Перамагла Юлія Герасіменка з Петрыкава. Дарэчы, фэст яшчэ раз прадэманстраваў: традыцыі палешукоў, як і ўсіх астатніх жыхароў Беларусі, цікавыя не толькі прадстаўнікам старэйшага пакалення, але і моладзі.

Міра ІЎКОВІЧ

# Спадчына як брэнд




*Паводле міністра культуры Рэспублікі Беларусь Юрыя Бондара, фестываль «Кліч Палесся» адкрывае патаемныя куткі багатай беларускай культуры. Радасна, што ў культурным жыцці краіны ёсць такая яркая падзея, як «Кліч Палесся», фестываль, які атрымаў жыццё дзякуючы ініцыятыве кіраўніка дзяржавы.*